Под научным руководством А. А. Круглова защищены 4 кандидатские диссертации. Ученый награжден знаком «Отличник образования Республики Беларусь».

Анатолий Агапеевич – отзывчивый и доброжелательный коллега, который всегда стремится помочь талантливым людям. Кстати, он и сам талантлив не только в науке: недавно издан сборник с его песнями. Хочется поздравить А. А. Круглова с очередной важной вехой в жизни и пожелать ему оставаться еще долгие годы таким же энергичным, достигать новых научных вершин, воплощаемых в книгах и учебниках.

***В. А. Федосик,***
доктор исторических наук, профессор
***О. И. Малюгин,***
кандидат исторических наук, доцент

# Богдан РОК

# Bogdan ROK



Вядомаму польскаму гісторыку-медыявісту, доктару гісторыі, прафесару Вроцлаўскага ўніверсітэта Богдану Року 25 лютага 2017 г. споўнілася 70 гадоў.

Нарадзіўся Б. Рок у в. Прусы ў Дольскай Сілезіі Вроцлаўскага ваяводства. Бацькі яго паходзілі з Беларусі: маці доўгі час жыла ў Мінску, а бацька нарадзіўся на Свянцяншчыне. Гэта ў пэўным сэнсе адбілася на самасвядомасці выдатнага гісторыка.

Атрымаўшы ў свой час адукацыю ў ліцэі, Б. Рок паступіў у Вроцлаўскі ўніверсітэт, а пасля заваршэння навучання ў ім у 1978 г. паспяхова абараніў дысертацыю, прысвечаную эпосе Сасаў у гісторыі Рэчы Паспалітай, пасля чаго пачаў выкладаць у родным універсітэце. У 1991 г. Б. Рокам была паспяхова абаронена праца на саісканне ступені *doctor habilitatus*, прысвечаная актуальнай і малавядомай праблеме – уяўленням аб смерці і замагільным жыцці пануючага саслоўя Рэчы Паспалітай у XVIII ст. (у Беларусі тэма пачынае распрацоўвацца толькі цяпер).

Абарона працы дазволіла Б. Року ў 1995 г. стаць экстраардынарным, а ў 1999 г. – ардынарным прафесарам, што прывяло да актывізацыі яго навуковай і адміністрацыйнай дзейнасці. Ужо ў 1993–1994 гг. Б. Рок працаваў намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце ў Інстытуце гісторыі Вроцлаўскага ўніверсітэта, у 1996–2002 гг. з'яўляўся намеснікам дэкана, а ў 2002–2008 гг. – дэканам аддзялення гістарычных і педагагічных навук Вроцлаўскага ўніверсітэта. Навуковец праявіў сябе як актыўны арганізатар Вроцлаўскага цэнтра культурнай гісторыі і гісторыі ментальнасці, выдавец крыніц, заснаваных на запісах вандроўнікаў з Рэчы Паспалітай, спецыяліст у сферах гісторыі медыцыны і этнічных меншасцей. Слынны прафесар – аўтар больш за 200 работ.

Навуковая дзейнасць прафесара Б. Рока аказала заўважны ўплыў на агульнае развіццё гісторыі ментальнасці, інтэлектуальнай гісторыі, а таксама новай культурнай гісторыі, ці гістарычнай антрапалогіі, у Польшчы. Акрамя распрацоўкі тэарэтычнага апарату гістарычных ведаў, прафесар Б. Рок займаецца пошукам і апрацоўкай разнастайных гістарычных крыніц. Так, толькі падчас падрыхтоўкі сваёй дысертацыі «Польскія календары саксонскага перыяду» (*Kalendarze polskie czasów saskich*, 1985), якая стала адной з найлепшых прац па гісторыі паўсядзённасці Рэчы Паспалітай, ён

здолеў знайсці і ўвесці ў навуковы зварот больш за 600 такіх календароў, што адразу надало Б. Року статус спецыяліста ў галіне крыніцазнаўства. Да цяперашняга часу ён не перастае актыўна працаваць у архівах і знаходзіць новыя гістарычныя крыніцы.

Прафесар Б. Рок – вядомы археограф, які апрацаваў і выдаў вялікую колькасць такіх крыніц. У першую чаргу яго цікавілі дзённікі і апісанні падарожжаў жыхароў Рэчы Паспалітай: запісы Л. Сяніцкага пра Заўралле і Сібір, нататкі ананімнага шляхціца з Беларусі аб падарожжы ў Санкт-Пецярбург, дзённікі француза Я. Харкевіча пра вандроўку з Вільні да Валенсіі, дыярыуш Тэафілі Канстанцыі Мараўскай з Радзівілаў аб еўрапейскім падарожжы і інш. Прафесар Б. Рок з'яўляецца рэдактарам выдавецкай серыі *Peregrinationes Sarmatarum*, у межах якой публікуюцца падобныя дзённікі падарожжаў. На цяперашні момант выйшлі два тамы: дыярыуш падарожжа ў Рым Якуба Ланхаўза і каноніка Балтазара Пстраконскага, а таксама дзённік францысканца Рэмігіуша Завадскага пра паездку ў Рым у 1750 г.

Акрамя актыўнай навуковай дзейнасці, прафесар Б. Рок надае вялікую ўвагу педагагічнай працы, найперш падрыхтоўцы студэнтаў, аспірантаў і дактарантаў. Пад яго кіраўніцтвам абаранілі кандыдацкія і доктарскія працы знаныя сучасныя польскія гісторыкі П. Бадына, Ф. Валянскі, Я. Вэнгляж, Я. Шымала і інш. Тэматычна іх працы ахопліваюць увесь спектр гістарычнай антрапалогіі, гісторыі ментальнасці і новай культурнай гісторыі.

Прафесар Б. Рок вылучаецца значнай прыхільнасцю да Беларусі. З яго ініцыятывы ў 1998 г. паміж гістарычным факультэтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Вроцлаўскім універсітэтам падпісана пагадненне, у выніку якога адбылося не менш за 40 узаемных абменаў аспірантамі, магістрантамі і студэнтамі. Абодва бакі атрымалі эфектыўна падрыхтаваныя навуковыя кадры.

Як сябра нашага ўніверсітэта, Богдан Рок вызначыўся і тым, што доўгі час уваходзіў у склад рэдакцыйнай калегіі часопіса «Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права», а цяпер з'яўляецца членам рэдкалегіі новага выдання «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя».

Калектыў гістарычнага факультэта БДУ, кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, рэдакцыя часопіса ад усёй душы зычаць шаноўнаму юбіляру моцнага здароўя, шчасця, доўгіх гадоў жыцця і творчых поспехаў.

***С. А. Захаркевіч,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
***Ю. Л. Казакоў,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

# Владимир Сергеевич КОШЕЛЕВ

# Vladimir Sergeevich KOSHELEV



В этом году двойной юбилей – свое 70-летие и 50-летие научно-педагогической деятельности – отмечает доктор исторических наук, профессор заведующий кафедрой истории нового и новейшего времени БГУ Владимир Сергеевич Кошелев.

Родился В. С. Кошелев 1 июня 1947 г. в д. Сосновка Пружанского района Брестской области в крестьянской семье. В 1963 г. поступил на исторический факультет БГУ, который окончил в 1967 г., после чего был зачислен в аспирантуру БГУ. На кафедре новой и новейшей истории исторического